*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 51 (63) | Нядзеля, 28 кастрычніка 1945 г.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 28-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі, сяляне Акцябрскага, Аніскавіцкага сельсоветаў завяршылі выкананне плана збожжанарыхтовак.

Па прыкладу перадавікоў хутчэй разлічымся з дзяржавай па хлеба-і бульбапастаўках, падрыхтуем дастойную сустрэчу вялікаму святу!

## Узмацніць тэмпы здачы бульбы дзяржаве!

Разгарнуўшы перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва, сяляне нашага раёна паспяхова заканчваюць асноўныя сельскагаспадарчыя работы бягучага года. У выніку сацыялістычнага спаборніцтва, сяляне Акцябрскага, Аніскавіцкага сельсоветаў паспяхова завяршылі хлебанарыхтоўкі дзяржаве. Адначасова з выкананнем хлебапаставак Акцябрскі сельсовет ідзе першым у раёне і па здачы бульбы дзяржаве.

Але асабліва ў раёне ганебна адстаюць і тармозяць выкананне плана бульбанарыхтоўкі Гарадзецкі сельсовет (старшыня т. Карпінчык)—на 26 кастрычніка выканаў план на 23 проценты, Худлінскі (старшыня т. Труш)—на 22 проценты і другія. А між тым у гэтых сельсоветах копка бульбы ўжо закончана і сельсоветы знаходзяцца побач з нарыхтоўчым пунктам.

У чым-жа справа такіх нізкіх тэмпаў здачы бульбы дзяржаве? Уся віна ў тым, што кіраўнікі сельсоветаў дапусцілі чарговасць у рабоце: закончым адну работу, потым возьмемся за другую.

Але ніяк не хоча чакаць час. Ужо пачаліся замаразкі. Набліжаецца зіма. Усім вядома, што патрэбна найхутчэй здаць бульбу на нарыхтоўчыя пункты. Задача зводзіцца к таму, каб у бліжэйшыя дні поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па бульбанарыхтоўках па кожнай вёсцы, па кожнаму двару. Рашуча ўзмоцнім тэмпы здачы бульбы дзяржаве!

## Узнагароджанне многадзетных мацярэй ордэнамі і медалямі

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 25 верасня 1945 года узнагароджана ордэнамі і медалямі вялікая група многадзетных мацярэй Брэсцкай вобласці. Сярод узнагароджаных ордэнам „Матерынская слава" II ступені Валасевіч Анна Іванаўна—хатняя гаспадыня вёскі Лідзіопаль, Худлінскага сельсовета, нарадзіўшая і выхаваўшая восем дзяцей.

Нарадзіўшых і выхаваўшых сем дзяцей узнагароджаны ордэнам „Матерынская слава" III ступені Бенесь Ольга Пятроўна, Бандарчук Агаф'я Пятроўна, Ігнацюк Ольга Антонаўна—хатнія гаспадыні вёскі Дзераўная, Дзераўноўскага сельсовета; Валасевіч Хаўронья Лявонцеўна—хатняя гаспадыня вёскі Худлін, Худлінскага сельсовета; Крук Параскоўя Іосіфаўна—хатняя гаспадыня вёскі Галоўчыцы, Галоўчыцкага сельсовета; Краўчук Анна Данілаўна—хатняя гаспадыня вёскі Масткі, Дзераўноўскага сельсовета; Каралюк Агаф'я Фёдараўна—хатняя гаспадыня вёскі Карсунь, Галоўчыцкага сельсовета; Каўшук Анна Фёдараўна—хатняя гаспадыня вёскі Камянец-Шляхецкі, Акцябрскага сельсовета; Несцюк Анна Гардзееўна—хатняя гаспадыня вёскі Грушава, Худлінскага сельсовета; Сітанасіцкая Еўдакія Сілаўна—хатняя гаспадыня вёскі Гарадзец, Гарадзецкага сельсовета.

Нарадзіўшых і выхаваўшых шэсць дзяцей узнагароджаны медаллю „Медаль материнства" I ступені Нікалайчук Анна Сцяпанаўна—хатняя гаспадыня вёскі Залессе, Дзеткавіцкага сельсовета; Селівончык Анна Данілаўна—хатняя гаспадыня вёскі Брадок, Заніўеўскага сельсовета.

Хатняя гаспадыня вёскі Іласк, Іласкага сельсовета Новік Домна Нікіфараўна, нарадзіўшая і выхаваўшая пяць дзяцей, узнагароджана медаллю „Медаль материнства" II ступені.

## ПА РАЁНУ

### ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ КРЭДЫТЫ СЯЛЯНАМ

Партыя і ўрад праяўляюць выключныя клопаты аб гаспадарках, якія пацярпелі ад нямецкай акупацыі. Згодна пастановы ўрада для аказання дапамогі ў аднаўленні жылых дамоў і надворных пабудоў, а таксама на набыццё рабочай і прадуктыўнай жывёлы сялянскім гаспадаркам, рабочым і служачым, дэмабілізаваным з Чырвонай Арміі адпускаюцца доўгатэрміновыя крэдыты.

У нашым раёне выдана крэдытаў на суму 70 тысяч рублёў.

Тэрмінам на 5 год атрымалі крэдыты на будаўніцтва і аднаўленне жылых дамоў сяляне Дзераўноўскага сельсовета Мінчук Ліда П., Якімовіч Мартын Т., Краўчук Іван М. і другія.

Выдача крэдытаў працягваецца.

### АДНАЎЛЕННЕ МЛЫНА

У Дзеткавічах на месцы ўзарванага нямецка-фашысцкімі захопнікамі памяшкання млына, адбудавана новае. Днямі тут адбыўся пуск і выпрабаванне газагенератарнай машыны ў 80 конскіх сіл. Вялікую ініцыятыву ў рамонце машыны праявіў механік т. Гранік.

Зараз тут ідзе ўстаноўка камней.

## Аб выбарчых акругах па выбарах у Совет Саюза

На падставе артыкула 34 Канстытуцыі СССР і артыкулаў 24 і 26 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 16 кастрычніка г. г. утворана 656 выбарчых акруг на выбарах у Совет Саюза

у тым ліку:

**Беларуская ССР.**

Брэсцкая вобласць

**519. Брэсцкая выбарчая акруга** (цэнтр—г. Брэст)

г. Брэст і раёны: Брэсцкі, Высакоўскі, Дамачэўскі, Маларыцкі, Камянецкі, Жабінкаўскі і Шарашэўскі.

**520. Кобрынская выбарчая акруга** (цэнтр—г. Кобрын)

раёны: Дзівінскі, Кобрынскі, Пружанскі, Косаўскі, Ружанскі, Антопальскі і Беразоўскі.

## Аб выбарчых акругах па выбарах у Совет Нацыянальнасцей

На падставе артыкула 35 Канстытуцыі СССР і артыкулаў 25 і 26 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 16 кастрычніка г. г. утворана 631 выбарчая акруга на выбарах у Совет Нацыянальнасцей

у тым ліку:

**Беларуская ССР**

**58. Брэсцкая выбарчая акруга** (цэнтр—г. Брэст)

г. Брэст і раёны: Брэсцкі, Высакоўскі, Дамачэўскі, Камянецкі, Маларыцкі, Шарашэўскі і Жабінкаўскі.

**59. Кобрынская выбарчая акруга** (цэнтр—г. Кобрын)

раёны: Антопальскі, Беразоўскі, Дзівінскі, Кобрынскі, Косаўскі, Пружанскі і Ружанскі.

(БЕЛТА.)



У калгасе „Аб'еднаная праца“, Пашэхона-Валадарскага раёна, Яраслаўскай вобласці, ідзе будаўніцтва калгасных дамоў.
На здымку: дамы калгаснікаў, пабудаваныя ў дні Айчыннай вайны для сем'яў ваеннаслужачых. Фото Каралёва. Фотахроніка ТАСС

## АНІСКАВІЦКІ СЕЛЬСОВЕТ ВЫКАНАЎ ПЛАН ХЛЕБАНАРЫХТОВАК

**Рыхтуючы дастойную сустрэчу 28-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, сяляне Аніскавіцкага сельсовета на 25 кастрычніка выканалі гадавы план хлебанарыхтовак дзяржаве на100,5 процантаў.**

## Як мы ліквідавалі адставанне па хлебапастаўках

Старшынёй Першамайскага сельсовета я працую другі месяц. Да гэтага часу наш сельсовет на хлебапастаўках быў на 11—12 месцы ў раёне.

Каб сельсовет вывесці з адстаючых, трэба было затраціць на гэта шмат часу. Для гэтага арганізаваў актыў сельсовета, які ўзяў абавязацельства датэрмінова выканаць план хлебанарыхтовак дзяржаве і ў кароткі тэрмін закончыць сяўбу азімых.

Для хутчэйшага завяршэння здачы збожжа дзяржаве арганізоўвалі малацьбу коннымі малатарнямі, аказвалі дапамогу ў перавозцы збожжа на пункты Заготзярно бясконным гаспадаркам.

Такая вёска, як Свеклічы, вельмі адставала па хлебапастаўках. Выявілася, што там адсутнічала масава-палітычная работа. Для дапамогі райком партыі нам даў сваіх упаўнаважаных. Яны сумесна з актывам растлумачылі сялянам важнасць своечасовай здачы збожжа дзяржаве. Завялі цвёрды ўлік у сельсовеце па збожжанарыхтоўках, склалі графік здачы хлеба.

Таксама была праведзена значная работа па выяўленню зямлі. Селянін вёскі Свеклічы Несцярук Дзяніс, які скрыў зямлю і не выконваў усіх відаў паставак дзяржаве, падвергнут народным судом штрафу на суму 23 тысячы рублёў. Была выяўлена скрытая зямля ў сялян вёскі Першамайск Козака—каля трох гектараў і Млынчыка—7 гектараў.

На 25 кастрычніка сельсовет выканаў план збожжапаставак на 86,7 процантаў. Вёска Віры, дзе працуе дэпутатам Якаў Неліповіч і вёска Толкава набліжаюцца да завяршэння хлебапаставак дзяржаве. Тут паспяхова ідзе здача хлеба ў фонд Перамогі.

У адказ на зварот калгаснікаў сельгасарцелі „Чырвоны хлебароб“, Гомельскага раёна па дастойнай сустрэчы 28 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, сяляне сельсовета абавязаліся ў бліжэйшыя дні поўнасцю выканаць хлебапастаўкі, паспяхова завяршыць сельскагаспадарчы год.

Н. Барысюк,
старшыня Першамайскага сельсовета

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ

ГЛ 14872 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.